УДК 882.6

**С.І. Даніленка**

# Мастацка-публіцыстычная дэманізацыя ворагаў СССР у лірыцы Якуба Коласа канца 40-х – пач. 50-х гг. XX ст.

У час Вялікай Айчыннай вайны полчышчы фашыстаў былі знішчаны пераможнай Савецкай Арміяй. Але ўсведамленне таго, што краіна працягвае знаходзіцца ў ахіленні смяротных ворагаў, працягвала жыць у савецкім грамадстве, што не магло не знайсці свайго адбітку ў паэзіі тых часоў. Асабліва паказальная ў гэтых адносінах вершаваная публіцыстыка патрыярха беларускай літаратуры Якуба Коласа. Менавіта ў яго творах паслядоўная дэманізацыя знешніх ворагаў СССР другой паловы 40-х – пачатку 50-х гг. XX ст. знайшла найбольш яскравае ўвасабленне, што тлумачыцца, відавочна, надзвычай моцным уплывам на творчую манеру паэта фальклорнай традыцыі – рысы амаль вызначальнай для творчасці ўсіх мастакоў слова, літаратурная дзейнасць якіх у пачатку XX ст. разгортвалася ва ўмовах «нашаніўства».

Між тым палітычная сітуацыя, што склалася ў свеце пасля заканчэння вайны, спараджала ўсё больш і больш ворагаў савецкай дзяржавы, бо на змену выбухам і страляніне былой «гарачай» вайны прыйшла ціхая «халодная» вайна, у якой у апошнім смяротным супрацьстаянні сышліся камунізм, а таксама капіталізм, сур'ёзна напалоханы яго імклівай экспансіяй у Еўропу. Першы «залп» «халоднай вайны» прагучаў 5 сакавіка 1946 г. у амерыканскім горадзе Фултан, дзе са сваёй праграмнай прамовай выступіў Уінстан Чэрчыль, што ў свой час быў адным з ініцыятараў стварэння антыгітлераўскай кааліцыі ЗША і СССР. У гэтай прамове былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі выказаў перасцярогу аб пагрозе тыраніі і таталітарызму для свабоднага заходняга свету, што ішла ад СССР, які стварыў «жалезную заслону» ад Шчэцына на Балтыцы да Трыеста на Адрыятыцы, і заклікаў да адзінства еўрапейскіх краін, пераможцаў і пераможаных у апошняй вайне, у змаганні супраць камуністычнай навалы. Канчаткова дактрына «халоднай вайны» супраць СССР была сфармулявана ў 1947 г. у пасланні прэзідэнта Гары Трумэна амерыканскаму кангрэсу. Але яшчэ раней гэтую ідэю падтрымала ў асобе папы Пія XII (пантыфікат 1939–1958) каталіцкая царква, што адступіла ад афіцыйнага на той час нейтралітэту і стала на бок Амерыкі і яе саюзнікаў у змаганні супраць камунізму. 1 чэрвеня 1946 г. напярэдадні выбараў у Італіі і Францыі, дзе камуністы і сацыялісты мелі вялікія шанцы на перамогу, папа рымскі звярнуўся з заклікам да італьянскага і французскага народаў, *«двух лацінскіх братоў, што валодаюць больш, чым тысячагадовай хрысціянскай культурай»*, каб тыя *«будавалі жыццё, абапіраючыся на моцную скалу хрысціянства»*, а не аддалі *«свае будучыя лёсы бяздушнай усемагутнай уладзе матэрыялістычнай дзяржавы, без ідэала, рэлігіі і Бога, што ўзвышаюцца над прыродай»* [1]. Такім чынам у ідэалагічнай рыторыцы папскага пасаду зноў паўстаў традыцыйны для хрысціянскай сімволікі вобраз

*«скалы»* пабожнасці, што ўзносіцца над варожым «морам» д'ябальскай матэрыялістычнай *«прыроды»*, увасобленай у дадзеным выпадку ідэалогіяй камунізму і яе праваднікам – СССР.

У сваю чаргу, беларуская савецкая паэзія ў асобе Якуба Коласа таксама працягвала выкарыстоўваць уведзены калісьці Сталіным у ідэалагічна-прапагандысцкі ўжытак вобраз магутнай краіны-*«скалы»*, што супрацьстаіць мутным хвалям буржуазнай рэакцыі. Так, савецкая краіна паўставала *«гранітнай скалой»*, што *«праз громы»* ўзнеслася *«над светам, не знаючы ўтомы»* («Да трыццацігоддзя Кастрычніка» (1947) [2]; у *«постаці гордай»* *«стаіць яна цвёрда»*, як *«волат, як міру скала»* («Ленінскім шляхам» (1952) [2, с. 395], як *«непахісная скала»* («Наша дарога» (Да дня вызвалення Мінска) (1947) [2, с. 377]. Пераможная Савецкая Армія таксама ўвасаблялася як *«непарушная скала»*, што і далей супрацьстаіць *«цёмнай сіле злой»* варожага капіталістычнага ахілення («Совецкай Арміі» (Пад новы, 1949 год) (1948) [2, с. 389]. Такім чынам, над руінамі пасляваеннай Еўропы ўзнесліся дзве *«скалы»*, і калі «капіталістычнай» *«скалой»* апекаваўся нябёсны хрысціянскі Бог, прадстаўлены сваім зямным намеснікам – папам, то апекуном *«скалы»* Камунізма быў бог зямны з «ўсявідным вокам», які і ўзнёс яе ўвысь на жах «струхлелым» нябёсам («Першы дэпутат» (1947): *«Грознай скалою над светам высока // Край наш Совецкі сягоння стаіць. // Смелае, зоркае Сталіна вока // Даль прабівае, нядрэмна глядзіць. // Бачыць ён ходы ўсе ворагаў злосных, // Чуе шыпенне двурушных «сяброў»* [2, с. 369].

У новых палітычных рэаліях амерыканскі бок імкнуўся *«прадэманстраваць узаемную згоду паміж Злучанымі Штатамі і Ватыканам і неабходнасць сумеснага выступлення супраць Савецкага Саюза і левых рухаў»* [1, с. 383]. Саюз з Ватыканам даваў Амерыцы магчымасць абвясціць «халодную вайну» з СССР у поўным сэнсе гэтага слова «свяшчэнным» змаганнем хрысціянскага свету супраць д'ябальскага камуністычнага воінства, калі гэтае змаганне станавілася маральным абавязкам кожнага хрысціяніна. Для дасягнення гэтай мэты ў 1947 г. амерыканцы апублікавалі таемную перапіску паміж Гары Трумэнам і Піем XII. У ёй перш за ўсё вызначалася агульная аснова для сумесных дзеянняў. Так, амерыканскі прэзідэнт, звяртаючыся да папы, вызначаў наступнае: «<...> *маё жаданне, як абранага кіраўніка народа Злучаных Штатаў, зноў выявіць упэўненасць у тым, каб разам з Вашым Святым Пасадам і з усімі ўстановамі свету, што маюць добрыя намеры,* <...> *супрацоўнічаць у інтарэсах моцнага міру. Моцны мір можа засноўвацца выключна на прынцыпах хрысціянства. Мы прысвяцім усе нашы духоўныя сілы і матэрыяльныя рэсурсы справе ажыццяўлення гэтага прынцыпу* <...>» [1, с. 384]. Трумэн у сваім лісце даў таксама вызначэнне паняццю «агульны вораг»: *«Мы павінны верыць, што чалавецтва будзе жыць у міры, а не ў ланцугах маны, а менавіта ў ланцугах калектыўнага ўладкавання жыцця»* [1, с. 384]. Такім чынам, гэтым агульным ворагам былі камунізм, заснаваны на прынцыпах калектывізму, і Савецкі Саюз як праваднік гэтай ідэалогіі.

У сваім адказе, які датуецца 26 жніўня 1947 г., папа выказвае згоду далучыцца да новага «крыжовага паходу» і фармулюе яго ідэйны падмурак. Паводле перакання Пія XII, збліжэнню спрыяе тое, што абодва бакі імкнуцца дасягнуць такога моцнага міру, асновай якога з'яўляецца хрысціянская вера і пільнаванне буржуазных правоў, што засноўваюцца на ёй. Таму *«буржуазнае грамадства мае боскае паходжанне і прыстасавана да самой прыроды»*. Такім чынам, абарона буржуазнага ладу з'яўляецца агульнай асновай, і непазбежным наступствам парушэння такога парадку будзе вайна [1, с. 384]. Далей рымскі пантыфік адзначае, што царква на працягу сваёй гісторыі часта супрацьстаяла грахоўным уладам, падвяргалася ганенням і пераследу, але за-

ставалася нязломнай. Гэтую нязломнасць і бескампраміснасць павінен быў у чарговы раз прадэманстраваць новы саюз: «*Царква не можа заключаць кампрамісы з абвешчаным ворагам Бога <...> Той чалавек лепш за ўсё служыць сваёй Радзіме, які найбольш верна служыць Богу <...> Царква тым, што і далей будзе кіраваць людзьмі і народамі і скіроўваць іх пры дапамозе ўсіх сродкаў, што маюцца ў яе распараджэнні, на пільнаванне сваіх абавязкаў у адносінах да Бога, дзейсна спрыяе ўсталяванню міра ва ўсім свеце і вечнаму благадзенству чалавецтва*» [1, с. 385]. Таму дзеля «*ўсталявання міра ва ўсім свеце*» папа ў сваім апостальскім пасланні ад 12 лютага 1949 г. абвясціў «*вызваленчую вайну*» супраць сацыялістычнага лагера справядлівым «дзяяннем» [1, с. 386].

Такім чынам, задачай Злучаных Штатаў і іх сатэлітаў з'яўлялася арганізацыя і кіраўніцтва палітычнай, эканамічнай і ваеннай сферай супрацьстаяння варожых сістэм, а задача Ватыкана заключалася ва ўмацаванні веры ў кожным каталіцкім народзе Еўропы, ідэалагічнай абароне ўнутранага буржуазнага ладу, што лічыўся хрысціянскім і «багададзеным» [1, с. 385].

Гэтым самым перадвызначыўся і набор новых ворагаў савецкай дзяржавы, што зрабіліся персанажамі беларускай савецкай вершаванай публіцыстыкі. Перш за ўсё гэта прадстаўнікі палітычных эліт заходняга свету, «*свету старога, свету гнілога, апастылага*»: «*трумэны*», «*маршалы*», «*Бевін*», «*Блюм пусты*» («Першы май» (1948) [2, с. 381]. Акрамя амерыканскага прэзідэнта Гары Трумэна (1884–1972) Якуб Колас уключае ў першы шэраг ворагаў савецкай дзяржавы Джорджа Маршала (1880–1959), начальніка штаба арміі ЗША ў Другой сусветнай вайне, а ў перыяд з 1947 г. па 1949 г. – дзяржаўнага сакратара Злучаных Штатаў, аўтара «плана Маршала» па аказанні разбуранай вайной Еўропе амерыканскай эканамічнай дапамогі, за рэалізацыю якога атрымаў у 1953 г. Нобелеўскую прэмію міра. Далей згадваюцца Эрнс Бевін (1881–1951) – у 1945–1951 гг. міністр замежных спраў Вялікабрытаніі, які ў каментарыях да Збору твораў Якуба Коласа ў 1952 г. характарызуецца як «*адзін з англаамерыканскіх падпальшчыкаў вайны*» [2, с. 446], а таксама Лявон Блюм (1872–1950) – зняволены немцамі ў часы вайны лідэр Французскай сацыялістычнай партыі, які ў 1946–1947 гг. узначальваў французскі кабінет міністраў («*лідэр французскай так званай соцыялістычнай партыі; праводзіў антысовецкую палітыку і з'яўляўся адным з заўзятых прыхільнікаў англаамерыканскага імперыялізму*») [2, с. 446].

Да другой групы ворагаў адносяцца прадстаўнікі буйнога капіталу, якія ўвасаблялі эканамічную магутнасць геапалітычных сапернікаў СССР: «*морганы і дзюпоны*» («Закон» Трумэна і К°» (1951) [2, с. 393]. У дадзеным выпадку паэт згадвае дзве цесна звязаныя між сабой фінансавыя групы ЗША, што кантралявалі ў той час значную частку фінансавага рынку краіны.

І ўрэшце галоўным ідэалагічным праціўнікам СССР паўстае «*папа рымскі стары*» («Закон» Трумэна і К°» (1951) [2, с. 394], а таксама «*зграі прадажных пісак*» («Да трыццацігоддзя Кастрычніка» (1947) [2, II, с. 379].

Такім чынам, свае пачэснае месца ў савецкіх бестыярыях эпохі «халоднай вайны» занялі прадстаўнікі палітычнай, эканамічнай і ідэалагічнай эліт заходняга грамадства. Ваенная сфера тут прадстаўлена пакуль што не была, бо сама вайна была ўсё ж «халоднай» і насіла пераважна «віртуальны» характар.

Для ўвасаблення варожых проіскаў супраць Краіны Саветаў у паэзіі ўжываліся звыклыя сродкі з арсеналу савецкай прапагандысцкай рыторыкі. Ворагі – гэта «*гады-вужы*», што злосна «*сыкаюць*» са сваіх замшэлых нор («Выглядаеш ты яснай вясной...» (1946) [2, с. 367], «*разяўляюць звярыныя ляпы*» («Першы май» (1948) [2, с. 381], з «*сыканнем злосным, сіпеннем змяіным*» «*гатуюць няволю свабодным краінам*», «*мараць аб новай вайне*»,

але «*лёс Гітлера*», лес «*акул і вампіраў*», што «*ўпалі ў прадонне*», іх «*не міне*» («Савецкія годы» (1948) [2, с. 387–388].

Ворагі – гэта «*спрут цвёрдалобы*», «*апостал крыві і ярма*», «*гад*», што «*выпоўзае <...> з небаскроба*», у паслугачах якога знаходзяцца «*падпальшчыкі новай вайны*», «*злавесныя цені-пачвары*», што «*ўпотай рыхтуюць пажары*», «*народам куюць кайданы*» («Савецкай Арміі» (Пад новы, 1949 год) (1948) [2, II, с. 389].

Тым самым паэт імкнуўся ўвасобіць прадажных буржуазных палітыкаў, якія служаць фінансаваму «*спруту*» з «*небаскроба*» і дзеля яго грошай імкнуцца несці па зямлі смерць і разбурэнне. Але з найбольшай яскравасцю гэтая думка ўвасоблена ў вершы «Закон» Трумэна і К°» (1951); Трумэн, «*бос убогі*», «*слуга марганаў і дзюпонаў*», «*бандытам*» «*долараў сыпле сто мільёнаў*». Ён абяцае даць ім «*атруту*» і «*зброю*», каб «*заўладаць <...> светам*» [2, с. 393]. Асвяціць сваім аўтарытэтам злачынствы «*бандытаў*», «*замаліць*» іх грахі павінен менавіта папа: «*За вас прасіць я буду бога // І папу рымскага старога. // Учынкі вашы мы аплацім. // Шпіёньце, шкодзьце як найболей, // Служыце нам, не спіце ў шапку, <...> Грахі-ж мы вашы ўсе замолім. // І шмат яшчэ казаў паганец, // Натхніцель чорнай сілы збродней...*» [2, с. 394]. Але марныя спадзяванні «*апосталаў войнаў*» на дапамогу папы і Бога, што страцілі сваю сілу перад абліччам моцы і магутнасці савецкай дзяржавы, якую «*не пужае іх хор непрыстойны*», бо «*ёсць Сталінскі геній*» і савецкі народ «*з ім*» («Роднаму краю і народу» (Да 30-годдзя БССР) (1948) [2, с. 386]. Таму папства і сам Бог, ад імя якога рымскі пантыфік заклікае да вайны з Камунізмам, аджылі свой век, бо ў іх «*няма сіл*» і «*той змогі*», каб «*жыццё ды назад павярнуць*» («Першы май» (1948): «*...Гаспадарыць над светам не ім! // Адцвілі, палінялі ціяры, // З'едзен моллю стары Ватыкан. // Ні малітвы яго, ні долары // Не паднімуць сатлелы іх стан*» [2, с. 381].

Супастаўленне ў адным сэнсавым шэрагу «*малітваў*» і «*долараў*» як сродкаў вядзення «халоднай» вайны заходняга свету супраць Савецкага Саюза надзвычай сімптаматычнае. У дадзеным выпадку «*долары*» павінны ўвасабляць палітычную волю заходняга кіраўніцтва на эскалацыю супрацьстаяння, падтрыманую фінансава-эканамічнымі магчымасцямі капіталістычнага спосабу вытворчасці, а «*малітвы*» – ідэалагічную падтрымку гэтага супрацьстаяння, забяспечаную каталіцкай царквой, што надзвычай яскрава выявілася ў вершы «Савецкія годы» (1948), дзе «*фашысцкага свету разбой*» імкнецца «*лад наш разбурыць*»: «*...Дзе стэрлінгаў фунты дружылі з доларам // І благаславенне злінялай ціяры // Йшло з імі дарогай адной*» [2, с. 387].

Разам з тым гэтае супастаўленне дае магчымасць Якубу Коласу зрабіць яшчэ больш радыкальную выснову: сапраўдным «богам» заходніх святароў з'яўляюцца грошы, якія здаўна лічыліся атрыбутам д'ябла. Таму заходнія святары разам з папам «прадаліся» д'яблу, бо «*бог адзін у іх – долары*» і «*клік адзін – вайна, пажары*» («Закон» Трумэна і К°» (1951) [2, с. 393], ім «*долар даражэй за кроў*» («Першы дэпутат» (1947) [2, 369]. Заходнія святары – «*цемрашалы*», якім «*мяшок доляраў – бог*», і таму ў сваёй д'ябальскай аслепленасці і апантанасці яны ўзнімаюць руку на царства сапраўднага бога-«*праведыра*» Сталіна, які «*ўзважыў ворага*», «*змерыў*», «*кінуў <...> ў прах*» («Наша дарога» (Да дня вызвалення Мінска) (1947) [2, с. 377–378], падобна да грознага Бога Старога Запавету, што «*змераў*», «*ўзважыў*» і «*падзяліў*» праклятыя ім за грахі д'ябальскі Вавілон (Даніїл 5, 24–28). Менавіта таму і «*іх лёс асуджаны, прапалы*» [2, с. 378].

Ахарактарызаваныя вышэй творы Якуба Коласа сведчаць аб тым, што ў савецкай беларускай вершаванай публіцыстыцы ўпершыню выяўляецца пафас асуджэння «несапраўднай» «няшчырай» рэлігійнасці заходніх святароў і

ўсяго заходняга грамадства; такая духоўная вера, як сведчыць фактуальнасць публіцыстычных вершаў, заснавана не на асновах хрысціянскай і агульначалавечай маральнасці, а на «кульце» грошай. Гэты пафас грунтуецца на свядомай дэманізацыі грошай як увасаблення матэрыяльнага дабрабыту і эканамічнай магутнасці заходняга грамадства, яны забяспечваюць яму перамогу ў «халоднай вайне», а таму абвяшчаюцца «дарункам д'ябла».

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Гергей Е.*** История папства. – Москва, 1996. – С. 382–283.
2. ***Колас Якуб.*** Збор твораў: У 7 т. – Т. 2. Вершы. Апавяданні вершам (1917–1952). – Мн., 1952. – С. 379.


## SUMMARY


*The article analyzes the process of creating a demoniac imagery of the USSR's political rivals in the context of traditional Buelorussian folklore imagery. The literary works of the 40–50-s (the XX$^{th}$ century), written by J. Kolas, a classic of Byelorussian literature, are taken as the material for the analysis.*